малюе”, “Хмарка” і іншых. Апавядаючы пра дзяцей нельга не ўспомніць кнігу “Другое чытанне для дзяцей беларусаў”, прызначаную для вучняў другага класа. Кніга павінна спрыяць навучанню іх роднай мове, пашырыць жыццёвы кругагляд.

# ТАПАНІМІКА ГРОДЗЕНСКАГА РЭГІЕНА

УА "Гродзенскі дзяржаўны медыцынскі ўніверсітэт»
Рэкець А. А., студэнт 5 курса медыка-псіхалагічнага факультэта
Кафедра рускай і беларускай моў
Навуковы кіраўнік – старшы выкладчык Варанец В. І.

Тапонімы – разрад оніма, уласнае імя, якое азначае назву прыроднага аб'екта на Зямлі ці аб'екта, створанага чалавекам на Зямлі. Тапонімы вывучаюцца навукай тапанімікай, якая з'яўляецца раздзелам анамастыкі.

Сярод тапонімаў вылучаюцца розныя класы, такія, як:

Аронімы – назвы паднятых формаў рэльефа (гор, хрыбтоў, вяршынь, узгоркаў);

- Спелеонімы – назвы прыродных падземных утварэнняў;
- Харонімы – назвы любых тэрыторый, абласцей, раёнаў;
- Урбанонімы – назвы ўнутрыгарадскіх аб'ектаў;
- Агаронімы – назвы плошчаў;
- Гадонімы – назвы вуліц;
- Драмонімы – назвы шляхоў паведамлення;
- Айконімы – назвы населенных месцаў;
- Асцінонімы – назвы гарадоў;
- Камонімы – назвы сельскіх паселішчаў;
- Гідронімы – геаграфічныя назвы водных аб'ектаў, у тым ліку:

Гелонімы – назвы балот, забалочаных мясцін;

Лімнонімы – назвы азёр;

Акіянонімы – назвы акіянаў;

Пелагонімы – назвы мораў;

Патамонімы – назвы рэк;

- Інсулонімы – назвы астравоў;
- Аграонімы – назвы выраблених зямельных надзелаў;
- Дрымонімы – назвы лясоў, пушчаў, бароў.

З лінгвістычнага пункту гледжання можна адзначыць тры задачы, якія выконваюць гадонімы:

1) дыферэнцыйная – абмежаванне аднаго аб'екта ад іншых;
2) семантычная – паведамленні пра гэты аб'ект;
3) семіятычная – фіксацыі сацыяльна значных сэнсаў. Гаданімія сфарміравалася як прынцыпова семантычная сістэма: найменні вуліц інфар-



Репозиторий ГрГМУ

муюць пра асноўныя збудаванн ігорада, пра яго рэльеф, сувязі з іншымі населеннымі пунктамі і пра жыхароў і іхзаняткі.

У групе арыентавальных гадонімаў можна вызначыць знешнія і ўнутраныя арыентыры. Да ўнутрыарыентавальных найменняў можна аднесці:

1) гадонімы, што выбіраюць у якасці аб'екта арыентацыі якое-небудзь збудаванне. Як прадукт чалавечай працы: вул. Завершчызна, вул. Каложа, вул. Маставая, вул. Партовая і інш.

2) гадонімы, што арыентуюць на які-небудзь прыродны аб'ект: вул. Батанічная, вул. Запрудная, вул. Неманская, вул. Палянная, вул. Рачная і інш.

Арыентавальным назвам супрацьпастаўляюцца назвы – характарыстыкі, якія падзяляюцца на 8 тыпаў:

1) назвы, звязаныя з характарыстыкай самой вуліцы: вул. Грыбная, вул. Голая, вул. Жаданая, вул. Чырвоная, вул. Меладычная, вул. Рамантычная і інш.

2) назвы, якія маюць семантыку суадносін ці параўнання з іншымі вуліцамі: вул. Бліжняя, вул. Верхняя, пер. Заходні, вул. Крайняя, вул. Ранняя, вул. Паўночная і інш.

3) назвы, у семантыцы якіх прысутнічае элемент, што абмалёўвае знешні выгляд вуліцы: вул. Асфальтная, вул. Блакітная, пер. Маляўнічы, вул. Залацістая, вул. Смарагдавая, вул. Шэрая, вул. Срэбраная, вул. Зялёная;

4) назвы, звязаныя са спецыфікай прафесіі жыхароў, з прадметамі і рэаліямі працы: вул. Агранамічная, вул. Гарбарская, вул. Кавальская, вул. Мулярная, вул. Паліграфістаў, вул. Ткацкая, вул. Фолюш, вул. Цагляная і інш.

5) назвы, у якіх адлюстроўваецца семантыка часу: вул. Жнівеньская, вул.Летняя, пер. Ліпеньскі, вул. Асенняя, вул. Вясенняя;

6) назвы, у семантыцы якіх назіраецца характарыстыка жыхароў вуліцы: вул. Ветлівая, вул. Добрая, вул. Мірная, вул. Смелая, вул. Умелая і інш.

7) назвы, у семантыцы якіх адзначаецца сувязь з раслінным і жывёльным светам: вул. Бабровая, вул. Васільковая, вул. Яловая, вул. Маліновая, вул. Арэхавая і інш.

8) назвы, у семантыцы якіх прысутнічае элемент, што апісвае форму ці рэльеф вуліцы: вул. Горная, вул. Кальцавая, вул. Аб'язная, вул. Гарыстая і інш.

ЛІТАРАТУРА:

1. Вашкевіч, А. Біяграфія гарадзенскіх вуліц. Ад Фартоў да Каложы / А. Вашкевіч, А. Госцеў, В. Саяпін. – Гродна-Вроцлаў : Вроцлаўская навуковая друкарня, 2012. – 370 с.

2. Падольская, Н. В. Слоўнік рускай анамастычнай тэрміналогіі / Н. В. Падольская. – Выд. 2-е, перапрац. и дап. – М. : Навука, 1988. – 192 с.

3. Саяпін, В. Таму ў гісторыю: набярэжная Нёмана [Электроны рэсурс] / В. Саяпин. – Рэжым доступу: http://grodnonews.by/category/istoriya/news1223.html. – Дата доступу: 25.09.2019.

Репозиторий ГрГМУ